После краткого исторически-географического экскурса по городу Ломоносову можно сделать следующие выводы:

Уникальное местоположение на южном берегу Финского залива вблизи Санкт-Петербурга создает возможность проведения различных международных спортивных соревнований на открытой воде. Чему способствует дорожно-транспортное сообщение (Кольцевая Авто Дорога, Таллиннское шоссе, Октябрьская железная дорога, паромы по Финскому заливу).

Славная история Ораниенбаумского плацдарма ставит город Ломоносов с его дворцово-парковым ансамблем Ораниенбаум в более предпочтительное положение с точки зрения культурного наследия, нежели туристические города конкуренты: Пушкин, Павловск, Петергоф, Гатчина, которые находились под немецкой оккупацией.

Наличие собственного герба, гимна, легенды названия города, делает город Ломоносов полноправным императорским городом. Проживание и деятельность выдающихся людей так же может способствовать открытию новых музеев и привлечению туристов.

**Кедрык Т.В.**

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ГАРАДОЎ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СВЯТА "ДАЖЫНКІ"

Мінск, Рэспубліка Беларусь

Захаванне і рэнавацыя культурна-гістарычнай спадчыны з'яўляецца важным пытаннем ў культурнай палітыцы любой дзяржавы. У нашай дзяржаве распрацаваны і ажыццяўляюцца рэспубліканскія і рэгіянальныя праграмы па ахове, рэнавацыі і рэінтэрпрэтацыі культурна-гістарычнай спадчыны. Рэалізацыя такіх праграм мае навуковую абгрунтаванасць і адпаведныя метады. У апошняе дзесяцігоддзе культурна-гістарычныя ландшафты беларускіх гарадоў апынуліся пад уздзеяннем пераўтварэнняў, якія адбываюцца падчас падрыхтоўкі да рэспубліканскіх святаў, такіх, напрыклад, як "Дзень беларускага пісменства" ці "Дажынкі". З кожным годам такія пераўтварэнні набываюць усё больш маштабны характар. Трансфармацыі ўключаюць змены трасіроўкі вуліц, будаўніцтва буйных спартыўных і іншых інфраструктурных аб'ектаў і рэнавацыю аб'ектаў архітэктурнай спадчыны. Паколькі большасць пераўтварэнняў рэалізуецца ў даволі хуткім тэмпе і па тыпавых планах, то ў такой сітуацыі пытанні захавання і рэнавацыі гістарычнай спадчыны гарадоў набываюць асаблівую актуальнасць і вастрыню. Амаль у кожным горадзе, дзе праходзіла такое свята можна знайсці значныя трансфармацыі

Репозиторий ВГУ

культурна-гістарычнага ландшафта, якія часта выклікаюць спрэчкі і нават канфліктныя сітуацыі.

На наш погляд, самы значны трансфармацыйны патэнцыялам мае свята працаўнікоў сяла "Дажынкі", якое праводзіцца штогод з 1996 года. "Сталіцамі" рэспубліканскіх "Дажынак" сталі ужо 16 раённых цэнтраў, невялікія гарады з насельніцтвам 40-60 тысяч чалавек.

Напачатку працэс падрыхтоўкі да свята насіў "касметычны" характар – асфальтавалі цэнтральныя вуліцы, фарбавалі фасады дамоў. Але з часам "дажыначныя" пераўтварэнні сталі своеасаблівай інвестацыйнай праграмай і з кожным годам сумы, якія выдзяляюцца на падрыхтоўку становяцца ўсё большымі, а пераўтварэнні маштабнымі. У мясцовай прэсе, якая апісвае трансфармацыі, можна сустрэць параўнанне "дажыначных" пераутварэнняў з аднаўленнем гарадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, у Кобрыне "Дажынкі" назвалі "трэцім днём нараджэння" [1, С. 50], які раўназначны з утварэннем горада і пасляваенным аднаўленнем.

Працэс трансфармацыі ужо набыў стандартызаваныя шаблонныя формы, што спрыяе сціранню культурнай разнастайнасці беларускіх рэгіёнаў, уніфікацыі. Такім чынам, у выніку пераўтварэнняў адбываецца сур'ёзная трансфармацыя культурнага ландшафту гэтых гарадоў: знікаюць традыцыйныя месцы памяці, штучна звонку насаджаюцца новыя. Склаўся пэўны "дажыначны стандарт" – набор аб'ектаў, якія павінны з'явіцца і якія часта не ўлічваюць унікальнасць і своеасаблівасць кожнага горада.

Рэнавацыя гістарычна-культурнай спадчыны не з'яўляецца галоўным прыярытэтам "дажыначных" пераўтварэнняў, але кожны раз гітарычныя будынкі і ландшафты трапляюць у эпіцэнтр трансфармацый, паколькі знаходзяцца ў цэнтральнай частцы гарадоў. Цяжка сказаць, што ёсць нейкая прадуманая паслядоўная стратэгія працы з архітэктурнай спадчынай пры падрыхтоўцы да "Дажынак". У некаторых выпадках аб'екты спадчыны не трапляюць у поле зроку і застаюцца у ранейшым, часта даволі занядбаным стане, у іншых – аб'екты спадчыны руйнуюцца, альбо пераносяцца, а ў некаторых, больш рэдкіх выпадках іх спасцігае лепшая доля – яны аднаўляюцца і становяцца значнымі элементамі гарадзкой прасторы. Прыкладам такіх станоўчых трансфармацый можна назваць, рэканструкцыю гарадской ратушы з гандлёвымі радамі ў Шклове і аднаўленне будынку езуіцкага калегіюма ў Воршы. Такія аб'екты не толькі станоўча уплываюць на вобраз горада, гарадзское асяроддзе, але павышаюць турыстычную прыцягальнасць горада. Але такіх станоўчых прыкладаў не зашмат.

Розныя падыходы да працы са спадчынай у працэсе падрыхтоўкі да "Дажынак" прадставім на прыкладзе шасці гарадоў, якія ў розныя гады былі "сталіцамі дажынак" – Мазыр (2001), Ваўкавыск (2004), Баб-

Рэпазіторый ВДУ

руйск (2006), Ворша (2008), Кобрын (2009), Маладзечна (2011).

У Мазыры у ліку аб’ектаў культурна-гістарычнай спадчыны, якія закранулі “дажыначныя” пераутварэнні, патрэбна назваць гістарычны цэнтр горада, які поўнасцю ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў і археалагічны помнік – мазырскае замчышча.

Плошча Леніна, якая з’яўляецца часткай гістарычнага цэнтра, у час падрыхтоўкі да “Дажынак” была крыху зменена – была павялічана яе пешаходная частка, але гэта не змяніла кардынальным вобразам кампазіцыйныя уласцівасці прасторы. Уся пешаходная частка была замошчана тратуарнай пліткай[1]. У ходзе апошняга савецкага этапа дабраўпарадкавання у цэнтры, у тым ліку і на плошчы Леніна была знесена вялікая колькасць драўляных будынкаў. У час падрыхтоўкі да “Дажынак” пытанне аднаўлення гэтай забудовы нават і не падымалася.

На мазырскім замчышчы, якое знаходзіцца на гары Камунараў, археалагічныя раскопкі праводзіліся яшчэ з 70-х гг., на яго тэрыторыі дзейнічаў мясцовы краязнаўчы музей. Менавіта “Дажынкі” паспрыялі паскарэнню даследаванняў і завяршэнню раскопак і узвядзенню ў 2005 годзе, да 850-годдзя горада, бутафорскага “старажытнарускага” замчышча.

У Ваўкавыску большасць гістарычных аб’ектаў не была закранута “Дажынкамі”. Толькі гістарычная забудова па вуліцы Жолудзева, якая вядзе з вакзала да цэнтру горада была адноўлена. Але гэта аднаўленне ажыццяўлялася ўласнікамі будынкаў (на вуліцы шмат крамаў) і таму нейкага стылістычнага адзінства і кампазіцыйнасці не назіраецца. Фасады некаторых цагляных будынкаў былі атынкаваныя ў выніку чаго страцілі элементы дэкору і згубілі сваё арыгінальнае аблічча.

Падчас падрыхтоўкі ў горадзе вяліся шырокамаштабныя земляныя работы, але археалагічныя раскопкі не праводзіліся, такім чынам археалагічныя культурныя слаі былі страчаныя.

Да ваенна-гістарычнага музея быў дабудаваны новы корпус, а стары, які і з’яўляецца гістарычным помнікам, быў касметычна адрамантаваны. Ніяк не закранулі пераўтварэнні касцёл, царкву, габрэйскія і каталіцкія могілкі.

Гістарыка-культурны патэнцыял Ваўкавыска выглядае недаацэненым, усе пераутварэнні былі накіраваны на стварэнне новых аб’ектаў, альбо на рамонт старых, відавочна, што актуалізацыя спадчыны не ўваходзіла тут у планы трансфармацый.

Бабруйск, па сутнасці, захаваў амаль увесь гістарычны цэнтр. Не-

[1] Патрэбна зазначыць, что плітка стане галоўным “трэндам” усіх постдажыначных гарадоў. Яна будзе класціся на ўсіх плошчах, тратуарах, сцежках у парках. Менавіта плітка стане самым запамінальным і станоўчым пераутварэннем для жыхароў амаль ва ўсіх гарадах.



Рэпазіторый ВГУ

кранутымі з пачатку XX стагоддзя засталіся цэлыя кварталы, вуліцы, гандлёвыя плошчы, якія складаюцца ў асноўным з аднапавярховых габрэйскіх цагляных ці драўляных дамоў з багатым дэкорам. Сярод іх ёсць некалькі выбітных будынкаў, занесеных у спісы культурна-гістарычнай спадчыны.

У выпадку Бабруйска тое, што гэтая забудова амаль не была закранутая "дажыначнымі" пераўтварэннямі, напэўна, з'яўляецца станоўчым фактам, хоць, зразумела, што шмат якія аб'екты патрабуюць рэнавацыі. Даволі шмат, нават у цэнтральнай частцы горада, закінутых будынкаў і будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца. Большасць з іх звязана з габрэйскай гісторыяй, якая ў гарадскім ландшафце наўмысна ці ненаўмысна не актуалізуецца. У горадзе амаль адсутнічаюць шыльды ці мемарыяльныя дошкі, якія адсылаюць да гэтага значнага гістарычнага пласта горада. Яскравым прыкладам можа служыць помнік драўлянай архітэктуры стылю мадэрн – дом купчыхі Кацнельсон, якая была мецэнаткай і ў свій час шмат зрабіла для горада. Пасля рэвалюцыі ў доме размяшчаўся рэўкам, а зараз знаходзіцца раённая бібліятэка. На доме маецца памятная дошка аб рэўкаме, але няма ніякіх згадак пра купчыху, дзякуючы якой гэты помнік архітэктуры з'явіўся.

Падчас "Дажынак" уздымалася пытанне яшчэ аднаго праблемнага для горада аб'екта – каталіцкага касцёла, да галоўнага фасада якога ў савецкія часы быў дабудавана адміністрацыйны будынак і закрыў сабой неагатычны фасад касцёла. Але бакі так і не дасягнулі паразумення ў вырашэнні гэтага пытання і фасад касцёла так і не аднаўлены.

Напэўна, адзіны культурна-гістарычны аб'ект, які выйграў ад "Дажынак" стала Бабруйская крэпасць. Галоўным стала тое, што свята дазволіла прыцягнуць увагу грамадзкасці і кіраўніцтва краіны да гэтага маштабнага помніка, які ужо пачаў разбурацца. Дзякуючы з'яўленню на тэрыторыі крэпасці лядовай арэны, частка крэпасці была дабраўпарадкавана, з'явіліся планы па яе рэвіталізацыі. Але пакуль гэтаму аб'екту не хапае інтэрпрэтатыўных мерапрыемстваў – інфармацыйных стэндаў, маршрутаў, бо з-за вялікай плошчы, якую займала крэпасць, не складваецца адзінага кампазіцыйнага уяўлення, а шыльды на будынках малаінфарматыўныя. Асаблівае засмучэнне выклікае лёс старэйшага будынку ў горадзе, які размешчаны на тэрыторыі крэпасці – былога кляштара езуітаў. Гэты помнік архітэктуры стылю ракако знаходзіцца ў поўным занядбанні і ужо некалькі разоў гарэў.

Самым станоўчым вынікам удзеяння "Дажынак" на Бабруйск стала, перш за ўсё тое, што нічога каштоўнага не было зруйнавана.

Напэўна, самым пазітыўным прыкладам з усіх гарадоў, дзе адбыліся "Дажынкі" ў плане рэвіталізацыі спадчыны стала Ворша.

Репозиторий ВГУ

Большасць пераутварэнняў адбываліся менавіта ў гістарычнай частцы горада. Быў рэканструяваны будынак былога езуіцкага калегіюма, дзе ў савецкія часы размяшчалася турма, будынак вадзянога млына і прылягаючага да яго моста пачатку XX ст., шэраг драўляных і цагляных будынкаў, быў дабраўпарадкаваны курган “Гарадзішча”, на старых мурах былой царквы узведзена новая, якая стылістычна ўпісваецца ў гістарычны ландшафт. Пры ўсіх станоўчых баках пераутварэнняў, патрэбна заўважыць, што быў знесены цагляны дом пачатку XX стагоддзя і кавалак драўлянай забудовы, пры аднаўленні калегіўма была знішчана частка былой манастырскай агароджы. Быў перанесены помнік У. Караткевічу, што стварыла канфліктную сітуацыю паміж уладамі і грамадзкасцю. Менавіта ў Воршы адбылася “гістарыізацыя” культурнага ландшафту і актуалізацыя спадчыны, што бузумоўна стварыла больш прыцягальны твар горада і дапамагло ў разбурэнні стэрэатыпа, які існаваў яшчэ з савецкіх часоў, што Ворша, перш за ўсё крымінальны горад. Рэвіталізаваныя аб’екты актыўна выкарыстоўваюцца гараджанамі – на гарадзішчы фатаграфуюцца маладыя, ў музеі “Млын” і ў калегіюме праводзяцца вясельныя абрады ў народным альбо шляхецкім стылі.

Можна сказаць, што “Дажынкі” сапраўды удыхнулі новае жыццё ў горад, але гэта адбылося не шляхам стварэння вялікай колькасці новых сучасных аб’ектаў, а менавіта шляхам рэвіталізацыі культурна-гістарычнай спадчыны і яе карэктнай рэінтэрпрэтацыі.

У Кобрыне, дзе даволі шмат культурна-гістарычнай спадчыны, не на яе была зроблена стаўка, а на цалкам новыя інфраструктурныя аб’екты, якіх з’явілася не мала. Рамонт кобрынскіх гістарычных будынкаў не ўлічваў іх гістарычнага мінулага, праектамі не былі прадугледжаны інтэрпрэтатыўныя элементы дэкору, па сутнасці, стылістыку рамонта можна ўкласці ў паняцце “еўрарамонт” – замена пакрыццяў дахаў на металапрофіль, устаноўка пластыкавых вокнаў і дзвярэй ў будынках на цэнтральных вуліцах, афарбоўка і атынкоўка. Можна знайсці элементы лёгкай рэтраізацыі прасторы – каваныя парэнчы, лаўкі, ліхтары ў рэтра-стылістыцы. Аднак, усё гэта не апелюе да нейкай пэўнай эпохі альбо стылістыкі. Таксама некалькі будынкаў, якія мелі гістарычную каштоўнасць быі знесены.

На месцы Дома культуры, першапачатковая рэканструкцыя якога па сутнасці стала узвядзеннем будынка наноў, былі знойдзены муры былой царквы, але ніякіх археалагічных прац не было праведзена.

У Маладзечна таксама пераштварэнні закранулі толькі цэнтральную частку горада. Была праведзена рэкампазіцыя Цэнтральнай плошчы – высечаныя дрэвы, павялічана плошча, перанесены камень “Пакутнікам за Беларусь”, на месцы якога некалі планавалася паставіць паўнавартасны помнік, а зараз быў пабудаваны фантан “Купал-

ле”.

Тэрыторыя з найбольшай канцэнтрацыяй помнікаў – плошча Старое места і прылягаючыя да яе вуліцы засталіся амаль не закранутымі “Дажынкамі”. Не было нават спробы пераўтварыць гэтую прастору ў турыстычнае месца і яно ніяк не было актуалізавана. Між тым, на плошчы і каля яе маецца некалькі аўтэнтычных аб’ектаў – царква, сінагога, старыя мяшчанскія дамы – якія б патэнцый маглі б стаць рэкрэацыйнай зонай.

Такім чанам, прыведзеныя прыклады паказалі, што культурна-гістарычная спадчына амаль заўсёды адчувае уздзеянне “дажыначных” пераўтварэнняў, але можна сказаць дакладна, што канкрэтных планаў, якія б улічвалі асаблівасць спадчыны як аб’екта няма. Усе станоўчыя змены са спадчынай, якія адбыліся, хутчэй можна аднесці да выпадковасцяў ці счаслівага збегу абставінаў, чым да прадуманай палітыкі ў гэтай сферы. Паколькі з кожным годам “дажыначныя” пераўтварэнні набываюць маштабнасць, то патрэбна ўжо на стадыі планавання прадумваць варыянты працы з культурна-гістарычнай спадчынай, яе рэнавацыю і рэінтэрпрэтацыю. Бо манавіта прадуманасць трансфармацый можа захаваць унікальныя культурныя ландшафты і павялічыць турыстычную прыцягальнасць малых беларускіх гарадоў.

**Жидченко А.В.**

## ГОРОДСКОЙ РАЙОН КАК ПРИМЕР СОХРАНЕНИЯ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ ДЛЯ РАЗВИТИЯ ТУРИЗМА (на примере омского «Городка нефтяников»)

Омск, Российская Федерация

На сегодняшний день туризм является одним из актуальных направлений развития российской экономики и экономики многих стран СНГ. Эта сфера не только приносит значительную прибыль, но также стимулирует множество смежных отраслей. В Российской Федерации в настоящее время сформировались крупные туристические центры, такие как Москва, Санкт-Петербург, Сочи, которые притягивают основную массу иностранных и отечественных туристов. В них ведется огромная работа по сохранению историко-культурного наследия, популяризации рекреационных зон и зон отдыха и т.д.

Однако развитие туристической отрасли возможно и в других регионах страны, даже в регионах, не отличающихся богатой, насыщенной интересными фактами историей, лишенными мировых культурных ценностей, живописных ландшафтов, памятников архитектуры и культуры. Среди таких мест можно выделить несколько Сибир-



Репозиторий ВГУ